Парушэнне патрабаванняў па ахове працы і звальненне

Невыкананне патрабаванняў аховы працы можа прывесці да траўміравання работнікаў. Аднаразовае грубае парушэнне патрабаванняў па ахове працы, што пацягнула калецтва або смерць іншых работнікаў, з'яўляецца падставай для звальнення парушальніка па ініцыятыве наймальніка ў адпаведнасці з абз. 6 п. 7 часткі 1 арт. 42 ПК.

*Даведачна: працоўнае калецтва - гэта шкода (устойлівая страта прафесійнай працаздольнасці альбо смерць), прычыненая жыццю або здароўю грамадзяніна ў выніку няшчаснага выпадку на вытворчасці.*

Звяртаем увагу, што не любое парушэнне патрабаванняў па ахове працы з'яўляецца падставай скасавання працоўнага дагавора. Парушэнне павінна кваліфікавацца як грубае.

Судовая практыка вызначае грубае парушэнне як відавочнае парушэнне патрабаванняў правілаў аховы працы, у тым ліку адпаведных інструкцый, правілаў і іншых нарматыўных прававых актаў па ахове працы, бяспечнай эксплуатацыі машын, абсталявання і іншых сродкаў вытворчасці, а таксама правілаў паводзін на тэрыторыі арганізацыі, у вытворчых, дапаможных і бытавых памяшканнях, якое знаходзіцца ў прамой прычыннай сувязі з наступствамі — калецтвам або смерцю іншых работнікаў (п. 40 пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 29.03.2001 №2 «Аб некаторых пытаннях прымянення судамі заканадаўства аб працы»).

Такім чынам, гэты пералік не з'яўляецца вычарпальным, наймальнік вызначае падставы для звальнення работніка ў кожным канкрэтным выпадку з улікам фактычных абставінаў парушэння. Прамая прычынная сувязь з наступствамі (калецтвам або смерцю іншых работнікаў) пацвярджаецца актам аб расследаванні няшчаснага выпадку альбо заключэннем судова-медыцынскай экспертызы.

Звальненне ў адпаведнасці з абз. 6 п. 7 часткі 1 арт. 142 ПК не залежыць ад факту прыцягнення работніка да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці за парушэнне патрабаванняў па ахове працы.

Начальнік Смаргонскага міжраённага
аддзела Гродзенскага абласнога ўпраўлення
Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы
С.Ю.Шатохіна
08.06.2020